№№126–127
(3256–3257)

13–16 жніўня 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Андрэй САННІКАЎ:

«Сваёй адмовай у правядзенні акцыі ўлада засведчыла тое, што датычна да знікнення людзей...»

Беларуская апазіцыя звярнулася ў Мінгарвыканкам з заяўкай аб правядзенні акцыі **"Патрабуем міжнароднага расследавання"** адразу пасля таго, як на расійскім тэлеканале НТБ выйшлі ў эфір фільмы "Хросны бацька" і "Хросны бацька-2", дзе ішла гаворка пра магчымую датычнасць да знікненняў **Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Юрыя Захаранкі і Дзмітрыя Завадскага** прадстаўнікоў вышэйшай беларускай улады.

Мэта мерапрыемства — прыцягненне да праблемы палітычных знікненняў увагі беларускай і міжнароднай грамадскасці.

Як і чакалася, адказ з Мінгарвыканкама прыйшоў адмоўны — сталічныя ўлады акцыю забаранілі.

"У сераду вечарам я наведаў Мінгарвыканкам, з тым каб даведацца, ці дазволілі нам правядзенне акцыі, — распавёў адзін з яе заяўнікаў **Віктар Івашкевіч.** — *Канкрэтнага адказу я не атрымаў. У Мінгарвыканкаме паведамілі, што адказ на заяўку адправілі поштай, а што напісана там — не памятаюць.* (Смехатура, праўда? — **Рэд.**). *Ліст з Мінгарвыканкама мы атрымалі толькі 12 жніўня. У ім напісана, што акцыя забаронена, бо быццам бы неналежным чынам афармлена заяўка на яе правядзенне. Але гэта неканкрэтны адказ, бо ў ім не напісана, якую менавіта памылку дапусцілі заяўнікі...*

Тым не менш акцыя адбудзецца. Мы заклікаем усіх неабыякавых людзей прыйсці 16 жніўня ў 18.00 да будынка Акадэміі навук з партрэтамі зніклых. У каго не будзе магчымасці ўзяць з сабой партрэт — выдадзім яго на месцы".

У сваю чаргу старшыня Аб'яднаай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька** адзначыў, што тыя, хто прыйдзе 16 жніўня да будынка НАН Беларусі, закон не парушаць.

"З юрыдычнага пункту гледжання, ніякага парушэння закона няма, — тлумачыць ён. — *Ёсць папера Вярхоўнага суда Беларусі за подпісам яго старшыні* ***Валянціна Сукалы****, дзе чорным па белым запісана: людзі, якія збіраюцца ў пэўным месцы з партрэтамі каго-небудзь, закон не парушаюць, бо такі фармат акцыі не падпадае пад закон аб масавых мерапрыемствах — няма ні шэсця, ні мітынга. Таму калі міліцыя паважае рашэнне Вярхоўнага суда Беларусі, то не будзе ўжываць брутальную сілу ў дачыненні да ўдзельнікаў акцыі. Хаця ў Беларусі ніводная страхавая кампанія не дасць гарантыі, што ўлада не будзе разганяць акцыю..."*

Экс-намеснік міністра замежных спраў Беларусі **Андрэй Саннікаў** адзначаў: *"Сваёй адмовай у правядзенні акцыі ўлада ўсёсна ці нават прама засведчыла тое, што яна датычна да знікнення апазіцыйных палітыкаў".*

Лідэр кампаніі "Гавары праўду!" паэт **Уладзімір Някляеў** хоча ведаць: ці датычна да знікнення апазіцыйных палітыкаў вышэйшае кіраўніцтва Беларусі: *"Фільмы, у якіх расказвалася пра знікненні апанентаў улады, выйшлі ў эфір на расійскіх тэлеканах. На тэлеканалах суседняй дзяржавы, з якой мы сябруем. На мясцовых "адмарозках" такое не спіша... Таму я, як грамадзянін Беларусі, павінен ведаць: ці сапраўды ў знікненнях палітыкаў вінаваты нехта з вышэйшага кіраўніцтва краіны? Гэта мае законнае права..."*

Самым балючым пытаннем для арганізатараў падобных акцый застаецца малая колькасць удзельнікаў. Хацелася б на гэты раз памыліцца...

"Мы будзем рады бачыць усіх неабыякавых людзей 16 жніўня ля будынка Акадэміі навук, — гаворыць **Анатоль Лябедзька**. — *Але ў першую чаргу мы разлічваем на прадстаўнікоў палітычных партый, праваабаронцаў, прадстаўнікоў маладзёжных палітычных арганізацый... Менавіта яны ўласным прыкладам павінны паказаць, што неабыякавыя да сітуацыі са зніклымі палітыкамі... Гэта будзе як пасланне грамадству "Рабі, як я".."*

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Прэзідэнт Татарстана папрасіў у Беларусі збожжа і бульбы

Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі абацяў дапамагчы.

Прэзідэнт Рэспублікі Татарстан Рустам Мініханаў наведаў Беларусь з рабочым візітам.

На сустрэчы з Сяргеем Сідорскім Мініханаў заявіў, што ягоная рэспубліка зашкаўлена ў набыцці беларускіх збожжа і бульбы.

Спадар Мініханаў паведаміў, што замест плаваных раней 5 мільёнаў тон збожжа Татарстан збярэ сёлета толькі каля 700 тысяч тон з-за анамальна сухога надвор'я.

Прэзідэнт Татарстана дадаў, што ёсць неабходнасць таксама закупкі ў Беларусі сакавітых кармоў для жывёлы.

Сяргей Сідорскі пабяцаў дапамагчы чым зможа.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Ці пісаў Міхаіл Снягір ліст аб памілаванні?

Не так даўно "Народная Воля" паведамляла пра тое, у якую калонію перавялі ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча і як ён там пачуваецца. А чаму нічога не пішаце пра былога пракурора Міншчыны Міхаіла Снегіра? Як ён адаптаваўся да турэмнага жыцця? І ці накіраваў ён ліст Аляксандру Лукашэнку з просьбай аб памілаванні?

Іван ЛУКАШУК, Мазыр.

Як паведаміў "Народнай Волі" адвакат Міхаіла Снегіра Анатоль Шапялевіч, яго кліент яшчэ знаходзіцца ў СІЗА, у калонію яго не этапіравалі. Снягір дагэтуль вывучае пратакол судовага пасяджэння. Не выключана, што ён будзе падаваць наглядную скаргу. Прашэнне аб памілаванні на імя А.Лукашэнкі была пракурор Мінскай вобласці яшчэ не пісаў.

Марына КОКТЫШ.

Пранясе?

Верагоднасць пранікнення ў Беларусь радыенуклідаў з тэрыторый Расіі існуе ў выпадку моцных пажараў у Бранскай вобласці. Пра гэта паведаміў начальнік аддзела радыяцыйнага кантролю Рэспубліканскага цэнтра радыяцыйнага кантролю і маніторынгу навакольнага асяроддзя **Юрый Голікаў**.

ОФИЦИАЛЬНО

Борис БАТУРА: чиновники занимаются приписками и скрывают свои доходы

Председатель Миноблисполкома Борис Батура сделал в четверг ряд скандальных заявлений. Из них следует, что столичные чиновники насквозь коррумпированы, занимаются приписками и отмывают свои "грязные" доходы через жилищное строительство.

"Нужны самые жесткие меры за приписки в сельском хозяйстве, необходимо очень серьезно разбираться с приписками", — заявил Б.Батура в четверг на заседании Миноблисполкома.

"То, что приписки в Минской области были и в прошлом году, это всем понятно. Но почему об этом молчали Госконтроль, правоохранительные органы?" — сказал Б.Батура. При этом он предупредил, обращаясь к присутствующим на заседании Миноблисполкома председателям райисполкомов и другим чиновникам: *"Попробуйте теперь хоть раз приписать". "Я вас предупреждаю, что в любом деле нужен порядок и честность",* — подчеркнул председатель Миноблисполкома.

Батура отметил необходимость повышения роли контрольно- ревизионных служб. *"Контрольно-ревизионные службы должны работать на упреждение, работать так, чтобы потом не привлекали лиц к уголовной ответственности",* — сказал Б.Батура. *"Если вы заботитесь о своих кадрах, то должны заботиться о том, чтобы эффективно, а главное, результативно проходила работа контрольно-ревизионных служб",* - добавил чиновник. *"А если результаты ревизионных проверок мы прячем под сукно — толку не будет, а наоборот — последует развитие этого вида преступлений",* — сказал Б.Батура, имея в виду коррупционные преступления и приписки.

Обращаясь к присутствующим, председатель Миноблисполкома подчеркнул: *"Должен быть порядок во всем. Порядок и больше ничего. И тогда вы, мужики, будете спать спокойно".*

Б.Батура коснулся ситуации с госзакупками мяса и нарушениями в этой сфере. *"А если одному сказано: "Вези мясо на мясокомбинат", а он везет его "налево", нужно незамедлительно бить по рукам",* — подчеркнул он.

Председатель Миноблисполкома коснулся также ситуации с приобретением и строительством жилья чиновников. *"Я понимаю, что нужно строить жильё, но не лезьте вы через подставных лиц, действуйте легально",* — сказал он, обращаясь к присутствующим. *"Берите кредиты и стройте легально, чтобы можно было людям открыто сказать: вот мои доходы",* — сказал председатель Миноблисполкома.

Хто і калі становіцца пенсіянерам

Украінскія ўлады прынялі рашэнне аб паступовым павелічэнні ўзросту выхаду на пенсію для жанчын.

Цяпер пенсіённы ўзрост для мужчын складае ва Украіне 60 гадоў, для жанчын — 55. На працягу 10 гадоў, пачынаючы з наступнага, узрост выхаду на пенсію для жанчын будзе падвышаны да 60 гадоў.

Гэтая рэформа з'яўляецца адной з умоў атрымання Украінай крэдыту ад МВФ у памеры 15,3 мільярда долараў, паведамляе Радыё Свабода.

Сёння ўзрост выхаду на пенсію ва Украіне, Беларусі і Расіі з'яўляецца адным з самых нізкіх у свеце.

Узрост выхаду на пенсію ў розных краінах свету (у гадах)

	Мужчыны	Жанчыны
Беларусь	60	55
Расія	60	55
Украіна	60	55
Чэхія	62	60
Латвія	62	62
Эстонія	62	62
Літва	62,5	60
Казахстан	63	58
Грузія	65	60
Польшча	65	60
Вялікабрытанія	65	60
Італія	65	60
Бельгія	65	62
Нямеччына	65	65
ЗША	65	65
Нарвегія	67	67
Японія	70	70

Какая зарплата у работников Парка высоких технологий?

"Недавно читал в вашей газете статью руководителя Парка высоких технологий Валерия Цепкало. Интересно, а какова средняя зарплата работников Парка?"

Федор КРАПИВКА, Могилевская область.

За первые шесть месяцев 2010 года в Парке высоких технологий было создано 419 новых рабочих мест. Среднемесячная заработная плата работников составила 3 миллиона 416 тысяч рублей. Об этом сообщает сайт electroname.com со ссылкой на пресс-службу ПВТ.

Победы, Людмила!

На конкурсе "Мисс мира" в Китае от Беларуси выступит обладательница титула "Мисс Беларусь–2010" **Людмила Якимович**. В прошлом году за всеобщее признание боролась белорусская красавица Юлия Синдеева.

СЛЫШАЛИ?

«Боевое братство без границ» обещает Лукашенко навести порядок в стране

Группа бывших ветеранов боевых действий обратилась с письмом к Александру Лукашенко, в котором просит оказать содействие в создании организации "Боевое братство без границ", которая должна помочь президенту уничтожить коррупцию и навсегда покончить с войнами между силовыми структурами.

"На наших глазах страна превращается в частную тюрьму, в поле битвы преступных кланов за свои интересы, за близость к вашему телу, что дает им возможность безнаказанно разворовывать материальные ценности и сажать в тюрьмы своих конкурентов, — цитирует письмо сайт "Белорусский партизан". — Суды работают по заказу. Насыщенность преступными элементами государственных структур переходит все границы. МВД выявляет преступные элементы в структурах КГБ. КГБ отвечает им тем же. Таможня в состоянии войны с прокуратурой. С той и другой стороны сотрудники ведомств попадают в тюрьмы. Лучшие следователи прокуратуры сидят в следственном изоляторе (С.Байкова), умирают при странных обстоятельствах, а некоторые вынуждены скрываться за границей (руководитель антикоррупционного подразделения капитан В.Дудкин, О.Случек, Д.Петрушкевич...). От кого они скрываются? Александр Григорьевич, Вы понимаете, какая опасность нависла над страной, что лучшие следователи уже не могут положить Вам на стол материалы преступлений и еле успевают (самые продвинутые) унести ноги на чужбину. Они замахнулись скорее всего на неприкасаемых. Из чьей они банды?"

Как отмечается в письме, "война государственных институтов власти, тем более центральных ведомств, между собой наносит неосторимый вред стране. Все они в интересах дела обязаны сотрудничать между собой и с благодарностью содействовать друг другу. Они же бьются за личные интересы, посему у них нет времени на раскрытие тягчайших преступлений против наших граждан".

Ярким примером беззакония авторы обращения называют дело волковысских предпринимателей:

"Силовые, правоохранительные структуры и ведомства наконец решили всерьез заняться "государственной безопасностью" и ничего лучшего не придумали, как сфабриковать от начала и до конца дело о подготовке теракта группой несговорчивых афганцев против губернатора Савченко. Они "защищают нас с Вами с пролетарской ненавистью". Выбивают ложные показания у всех категорий граждан, от заключенных до госслужащих (Артюхевич, Козел, Романец, Шнитко, Пузиков, Л.Паремская, Ларин...). Сами предполагаемые жертвы Владимир Савченко, председатель райисполкома Михаил Савельев дают показания в пользу своих "палачей". Этот факт свидетельствует о том, что преступность в нашей стране перевесила чашу Фемиды. Этот процесс является тягчайшим преступлением всей правоохранительной системы против собственных граждан. Представьте, что творится в закрытых судах!!! Преступники судят невиновных. Страной управляет неприкасаемая банда преступников. Кто главарь этой группировки?"

Подписанты обращения отмечают, что "принципиальных, стоящих на страже закона и интересов нашего государства профессионалов становится все меньше. Их зверски убивают или смещают с постов (бывший министр МВД Ю.Н.Захаренко, бывший председатель КГБ Мацкевич, бывший Генеральный прокурор Божелко, бывший председатель Центризбиркома В.Гончар...). Вокруг Вас, господин Президент, сжимается кольцо алчных проходимцев".

"Вы, являясь непримиримым борцом с коррупцией, находитесь в большой опасности, и это настораживает. Не станет Вас, все это рухнет! — обращаются авторы послания к А.Лукашенко. — Мы, ветераны войны, понимаем, что Вы один уже не сможете победить эту уничтожающую государственность коррупционную систему, и предлагаем свою помощь в выявлении и наказании преступных элементов, парализовавших всю государственную систему. Выбирайте: с кем Вы?"

"С надеждой на цивилизованное будущее Беларуси" письмо от имени ветеранов войны подписал полковник **Владимир Бородач**. Дать более подробный комментарий о том, кто стоит за этим обращением, он отказался, сообщив только, что свои подписи под обращением поставили 15 боевых офицеров.

ДОСЬЕ «НАРОДНОЙ ВОЛИ»

Владимир Викторович Бородач, полковник запаса, в 1970 году окончил Минское суворовское военное училище, в 1974-м — Рязанское высшее воздушно-десантное училище, в 1986-м — Военную академию имени Фрунзе. В 1981—1983 годах участвовал в военных действиях в ДРА, имеет боевые награды СССР и других стран, получил два ранения и контузию.

В войсках специального назначения ГРУ прошел все командные должности. К моменту распада СССР командовал 5-й бригадой специального назначения, дислоцированной в Марьиной Горке под Минском. Приветствовал образование независимого белорусского государства. За патриотическую деятельность был уволен из рядов Вооруженных сил. Был активным сторонником оппозиционного кандидата Лукашенко на выборах 1994 года. После референдумов 1995-го и 1996 годов, организованных Лукашенко для укрепления своего политического положения, стал его активным оппонентом. Считал, что, поддержав его на выборах, совершил непростительную ошибку. Оправдывается тем, что она же окажется и последней.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
13—16 ЖНІЎНЯ 2010 г.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Ёсць у Вільнюсе школа, у якую завітвае беларускі пасол...

Карэспандэнты «Народнай Волі» наведалі ў Вільнюсе беларускамоўную сярэднюю школу імя Францішка Скарыны, якая не так даўно адзначыла сваё 15-годдзе. Што яны там убачылі і пачулі?

...Школу знаходзім даволі хутка, хоць яна і месціцца на ўскраіне літоўскай сталіцы. Месца проста цудоўнае! Як у курортнай зоне. Вакол прырода, школа не замуравана ў афсалт, як гэта звычайна ў горадзе. Зараз у навучальнай установе поўным ходам ідзе рамонт. Літоўскія і беларускія спецыялісты робяць усё, каб вучням было светла і ўтульна.

Пакуль дырэктара яшчэ няма, нашым гідам выступае выкладчыца музыкі **Валянціна КАВАЛЬЧУК**. Сама яна з Дзятлаўскага раёна, у школе працуе з 1997 года. Так хто лёс вызначыў.

— Дзеці самі высаджваюць кветкі, — распавядае спадарыня Валянціна, паказваючы прыгожыя клумбы. — У нас тут наогул зона экалагічнага эксперыменту, бо школа з экалагічным ухілам. Дзеці ўдзельнічаюць у конкурсе маладых вучоных свету, не так даўно 12-класніцы Алена Базар і Наталля Буко заняли ў ім першае месца. Першая пасля адвучылася ў Англіі і зараз працуе ў швейцарскім банку. Наталля скончыла Міжнародны экалагічны універсітэт імя Сахарава.

— Паглядзіце сюды: ахоўваемая пляцоўка доўгатэрміновага біялагічнага эксперыменту, — з гонарам паказвае нам выкладчыца. — Тут нічога не прыбіраецца, а затым глеба бярэцца на пробу. Як кажуць: у гэтым месцы гаспадарыць сама прырода. Вось яблынька, якую падарыў мінскі Батанічны сад. Мы яе пасадзілі ў гонар нашай настаўніцы — яна памерла ад анкалагічнага захворвання.

Ёсць у школы і свая Чарнобыльская алея. У гадавіну трагедыі і дзеці, і настаўнікі прыходзяць сюды і саджаюць кветкі. Цуд, але ў некалькіх метрах ад алеі мы знаходзім грыбы!

— Масляты, — канстатуе выкладчыца, але яе гэта не здзіўляе. — У нас і падасінавікі пад вокнамі растуць, і падбярозавікі. Памідораў насаджалі, малінік побач... На лужку гулянні праводзім, вогнішча палім.

З пытаннямі прыроднага характара паступова пераходзім да школьнай тэматыкі, і спадарыня Валянціна расказвае:

— У школе дзеці з пачатковых класаў вывучаюць чатыры мовы — беларускую, англійскую, літоўскую і рускую. З сёмага — французскую альбо нямецкую, хоць зараз, магчыма, такое правіла будзе ўведзена ўжо з 5-га класа. Школьныя праграмы ў нас літоўскія, але ў пачатковых класах абавязковае выкладанне ўсіх прадметаў ідзе толькі на беларускай мове. Але ў старэйшых фізіка, напрыклад, — на літоўскай. Не ўсе настаўнікі валодаюць беларускай мовай. У нас працуюць каля 30 выкладчыкаў, на пастаяннай аснове — 15—16. Астатнія — па сумяшчальніцтве. Дарэчы, англійскую мову ў школе выкладае армянін Армен Барсамян. У яго жонка літоўка.

Унутры будынка — таксама рамонт. Сустракаем зямлячку Кацярыну Пратасевіч. Выкладчыца Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва спрытна тынкуе сцены.

— Сюды мы накіраваны ў камандзіроўку ад камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, — распавядае яна. — Прыехала чалавек 25. Тут жывём, тут працуем. Хутка камандзіроўка заканчваецца...

Тым часам Валянціна Кавальчук працягвае:

— Пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын да нас прыязджаў. І 1 верасня, і ў Дзень гімназіі. Дарэчы, вучацца тут і дзеткі некаторых работнікаў беларускага пасольства ў Вільнюсе — Вікторыя Васільева, Аня Лохач...

Наш экскурсавод распавядае, што ў школе ёсць урокі танцаў, якія вядзе выпускнік, экс-чэмпіён свету па бальных танцах Артур Байр. На ўроках працы хлопчыкі і дзяўчаты вучацца не толькі майстраваць, але і гатаваць. Для гэтага ёсць спецыяльная кухня. І, як высветлілася, хлопчыкі да кулінарнай справы адносяцца з большым захапленнем, чым дзяўчаты. У жыцці ўсё гэта, безумоўна, спатрэбіцца...

Дырэктар школы **Галіна СІВАЛАВА** — яе заснавальніца — сустракае нас ветліва. У свой час яна працавала ў Гальшанах у спецінтэрнаце, пасля — у Альшанскай сярэдняй школе.

— Паглядзела я тады на свае беларускія заробкі і паехала ў Вільню, — шчыра прызнаецца Галіна Канстанцінаўна. — Каму належыць ідэя стварэння беларускамоўнай школы? Тады Таварыства беларускай культуры тут пакуль не было, а існаваў клуб "Сябрына", якім кіраваў Валянцін Стэх. Жылі яшчэ Лявон Луцкевіч, Янка Багдановіч... Вось так супольна і нарадзілася ідэя. Пачалі збіраць заявы на першы клас. Тады цэлы год колькасць дзяцей была няроўная. Дзеці то з'яўляліся, то знікалі — лічба вар'іравалася ад 7 да 12 чалавек у класе. І, натуральна, першы год псіхалагічна было вельмі складана. Нам аддалі пад школу дзіцячы садок, фінансаў практычна не мелі... Зрэшты, гэта тэма для асобнай размовы. А сёння мы можам ганарыцца. Шаснаццаты год існуе школа, падрыхтавалі ўжо каля 300 выпускнікоў. Чысткі беларусаў у нас навучаецца недзе каля 45 працэнтаў. Чвэрць — змешаныя беларусы, астатнія — грамадзяне іншых краін.

Галіна Канстанцінаўна расказвае цікавы выпадак. У школу прыехала здымачная група тэлебачання. Журналісты пытаюцца ў дзяцей, кім яны хочуць стаць, калі вырастуць. Сын дырэктара аэрапорта ў Дубаі, што ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, шчыра прызнаецца, што няблага было б заняць крэсла дырэктара аэрапорта "Мінск-2". Яшчэ ў аднаго запыталіся, у адказ пачулі: "Прэзідэнтам". І трэцяга, чацвёртага — прэзідэнтам, прэзідэнтам... І раптам адзін хлопчык на традыцыйнае пытанне тэлевізіёшчыкаў задумваецца, а затым выпальвае: "Ведаеце, я яшчэ дакладна не вызначыўся. Хачу альбо зайцоў разводзіць альбо стаць прэзідэнтам". Усе пакаціліся ад смеху.

— У гэтым годзе колькі будзе навучэнцаў у школе? — працягваем гутарку.

— Думаю, што не менш за 170. Самы цяжкі час у нас быў, калі ў Беларусі праійшоў рэферэндум па дзвюхмоўі, і дзяржаўнай мовай прызналі яшчэ і рускую. Тры месяцы ў школе быццам жалоба была. Не ведалі ж, як бацькі дзяцей адрэагуюць на гэта. Пасля гэтага да мяне прыехаў журналіст з нейкага рускага выдання і пытаецца: "А что вы будете делать, если вообще будет единое Союзное государство?" Я яму тады адказала так: "Кожны настаўнік і вучань купяць па вянку з жалобнай стужкай і напішуць: "На магілу беларускай незалежнасці". Пойдзем да беларускага пасольства і павесім гэтыя вянкі на жалезны плот". Гляджу, чалавека аж перакасіла ад жаху. Напэўна, уявіў, як гэта ўсё будзе выглядаць. А мне тады нават на душы палягчэла.

— Хто сёння фінансуе школу?

— Поўнасцю літоўскі бок. Беларускі раней даваў нам падручнікі, але зараз яны нам практычна не патрэбны — розныя праграмы. Бяром толькі падручнікі па беларускай мове і літаратуры для пачатковых класаў. На розныя курсы ў Беларусь выкладчыкі ездзяць бясплатна, Мінск дапамагае. Два аўтобусы горад школе падарыў. Праўда, за другі аўтобус давялося заплаціць больш за 20 тысяч долараў падатку — так патрабуюць законы Еўрасаюза. Праўда, мытнікі нам сказалі, што камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама мог нам здаць гэты аўтобус за 1 літ у год, і не трэба было б плаціць анікага падатку. Мы яшчэ 14 тысяч літаў уклалі ў рамонт (каля 6 тысяч долараў). Такі вось падарунак.

— Якую яшчэ дапамогу хацелі б атрымаць ад беларускіх улад?

— Добра было б, каб у гэтым годзе дапамаглі наладзіць сур'ёзную міжнародную экалагічную канферэнцыю. Не толькі для школьнікаў, але і на вышэйшым узроўні. Бо гэтай праблематыцы мы надаём вялікае значэнне. Чыноўніку, можа, гэта не трэба, але не варта забываць, што чыноўнік — гэта звычайны бюракрат. Мая методыка заключаецца ў тым, што палова выхавання дзяцей павінна праходзіць па-за ўрокамі і па-за школай. Яны павінны ўдзельнічаць у розных праектах, сустрэчах, акцыях... У гэтым плане мы за месяц праводзім столькі мерапрыемстваў, колькі ў звычайнай школе — за год.

"Я вельмі люблю Беларусь, — кажа на развітанне Галіна Канстанцінаўна. — *І Беларусь для мяне — гэта не толькі прэзідэнт альбо нейкі міністр. Беларусь — гэта Бацькаўшчына. І я ўсё зраблю для таго, каб гэтая беларускамоўная школа і надалей жыла, квітнела і развівалася..."*

Мне тады падумалася — усё ж такі як цудоўна, што такія беларускамоўныя школы ёсць паза межамі Беларусі...

Алесь СІВЫ.
Фота Віталя ГАРБУЗАВА.

Вільнюс—Мінск.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Як падпісваўся зварот наконт зніклых палітыкаў...

"Чытаў, што шэраг беларускіх палітыкаў накіравалі зварот у Савет Бяспекі ААН з заклікам разгледзець праблему знікненняў у Беларусі вядомых дзеячаў апазіцыі.

У інтэрнэце напісана, што заяву падпісалі старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання ***Станіслаў Шушкевіч****, былы намеснік міністра замежных спраў Беларусі* ***Андрэй Саннікаў****, віцэ-прэзідэнт Міжнародней федэрацыі правоў чалавека* ***Алесь Бяляцкі****, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі* ***Анатоль Лябедзька****, экс-старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі* ***Мечыслаў Грыб****, старшыня партыі "Справядлівы свет"* ***Сяргей Калякін,*** *сябра палітрады Аб'яднанай грамадзянскай партыі* ***Аляксандр Дабравольскі,*** *экс-міністр працы Беларусі* ***Аляксандр Сасноў****, правабаронца* ***Алег Волчак****, экс-дэпутат Палаты падстаўнікоў* ***Валерый Фралоў,*** *старшыня Партыі БНФ* ***Аляксей Янукевіч****, намеснік старшыні Партыі БНФ* ***Рыгор Костусеў,*** *старшыня мінскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ* ***Віктар Івашкевіч****, экс-міністр знешніх эканамічных сувязяў Беларусі* ***Міхаіл Марынич,*** *былы амбасадар Беларусі ў ФРГ* ***Пётр Садоўскі,*** *лідэр кампаніі "Гавары праўду!"* ***Уладзімір Няклява****, намеснік старшыні партыі "Справядлівы свет"* ***Алена Скрыган*** *і намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі* ***Яраслаў Раманчук.***

А чаму пад зваротам няма подпісаў старшыні руху "За свабоду" ***Аляксандра Мілінкевіча*** *і старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада)* ***Анатоля Ляўковіча?***

Антон КАРАНКЕВІЧ, Баранавічы".

"Шчыра кажучы, я крыху здзіўлены вашым пытаннем, — прызнаўся **Анатоль Ляўковіч.** — Справа ў тым, што ліст, у якім узрушаецца пытанне аб расследаванні спраў зніклых палітыкаў, я падпісаў. Мне яго прыносіў старшыня АГП **Анатоль Лябедзька**, у яго і ўдакладняйце..."

У сваю чаргу старшыня АГП расставіў кропкі над "і".

"Насамрэч было два лісты, накіраваных у еўраструктуры, — тлумачыць ён. — Першы, які накіраваны ў Савет Бяспекі ААН, мы прапаноўвалі падпісаць магчымым кандыдатам на прэзідэнцкую пасаду ад дэмакратычнай супольнасці, правабаронцам і людзям, якія раней працавалі на дзяржаўнай службе ці былі дэпутатамі.

Другі ліст з аналагічным тэкстам, які і падпісаў Ляўковіч, мы адправілі ў Еўрапарламент. Яго было прапанавана падпісаць усім старшыням дэмакратычных партый і рухаў...

Дарэчы, на сустрэчы, дзе прапаноўвалася падпісаць ліст у Еўрапарламент, прысутнічаў намеснік старшыні руху "За свабоду" **Юрась Губарэвіч**, але свой подпіс пад зваротам ён не паставіў. Можа, у іх руху такая пазіцыя?.. Мне цяжка сказаць, лепш спытайцеся ў Мілінкевіча".

"Чаму пад заклікамі разгледзець праблему зніклых палітыкаў, які быў накіраваны ў еўрапейскія структуры няма вашага подпісу?" — з такім пытаннем "Народная Воля" звярнулася да **Аляксандра Мілінкевіча**.

"Я нічога пра гэта не ведаю, — адказаў ён. — Я зараз у вёсцы, адпачываю, тут няма інтэрнэту... Ніхто мне ніякія заявы падпісваць не прапаноўваў..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

СІТУАЦЫЯ

Ветэранам давай Леніна...

Перайменаванне станцыі метро "Плошча Леніна" ў "Плошчу незалежнасці" будзе разглядацца ў Мінгарвыканкаме ў верасні. Пра гэта парталу TUT.BY паведаміла начальнік аддзела культурна-асветнай працы Упраўлення культуры гарвыканкама Вольга Лукашук.

15 сакавіка Камісія па найменаванні і перайменаванні вуліц пры Мінгарвыканкаме, у склад якой уваходзяць гарадскія чыноўнікі, дэпутаты гарсавета, галоўны мастак і прадстаўнікі грамадскасці, прыняла рашэнне пра шэраг перайменаванняў у сталіцы. Станцыі метро "Плошча Леніна" мусіла атрымаць назву "Плошча Незалежнасці", якую ўжо насіла з 1992-га па 2003 год.

Дэпутаты Мінгарсавета 25-га склікання меліся прыняць канчатковае рашэнне яшчэ напрыканцы сакавіка, аднак... не паспелі гэта зрабіць да сканчэння 4-гадовага тэрміну паўнамоцтваў.

Цяпер жа сітуацыя з перайменаваннем "Плошчы Леніна" невядначная. Як паведаміла спадарыня Лукашук, ветэранскія арганізацыі супраць такога рашэння. Адзін з сяброў сталічнай Камісіі па перайменаванні сказаў, што з улікам ветэранскай актыўнасці мае "вялікія сумневы" адносна станоўчага вырашэння гэтага пытання. Хоць каму не вядома, што Леніну не месца ў Мінску.

ВЕРДЫКТ

Юрыя Ільева апраўдалі

Былы генеральны дырэктар ААТ "Гомельшкло" апраўданы Магілёўскім абласным судом у поўным аб'ёме. Яго вызвалілі прама ў зале суда. За кратамі Ільеў правёў больш за год.

Рашэнне суда яшчэ не набыло юрыдычную моц — кожны з бакоў мае права яго апратэставаць ці абскардзіць.

Генеральны дырэктар ААТ "Гомельшкло" Юрый Ільеў быў затрыманы супрацоўнікамі КДБ у канцы мая мінулага года. Ён падазраваўся ў атрыманні буйнога хабару ад камерцыйных структур за нібыта спрыяльнае вырашэнне пытанняў, звязаных з рэалізацыяй прадукцыі, паведамляе БелаПАН.

У жніўні таго ж 2009 года супраць спадара Ільева супрацоўнікі КДБ распачалі яшчэ адну крымінальную справу па абвінавачанні ў злоўжыванні службовым становішчам. Зроблена гэта было паводле вышэйшу праверкі прадпрыемства Камітэтам дзяржкантролю. Былі выяўлены факты неэфектыўнага выкарыстання сродкаў, якія накіроўваліся ў межах інвестыцыйнага праекта на стварэнне вытворчасці паліраванага шкла.

Юрый Ільеў узначаліў ААТ "Гомельшкло" ў снежні 2000 года — праз чатыры месяцы пасля забойства папярэдняга генеральнага дырэктара Уладзіміра Запольскага.

Да гэтага ён быў на прадпрыемстве намеснікам дырэктара па пытаннях эканомікі і фінансаў. Ільеў прапанаваў праграму выхаду "Гомельшкла" з крызісу. Падчас ягонага прызначэння ўлічвалася меркаванне 43 працаўнікоў завода, якія падпісалі адпаведны зварот у Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры.

Пасля арышту Юрыя Ільева на прадпрыемства так і не прызначылі паўнавартаснага генеральнага дырэктара, а толькі выканаўцу абавязкаў. Цяпер ён мае поўнае права вярнуцца на сваю пасаду.

ФУТБОЛ

Генеральная рэпетыцыя

У мінулую сераду футбалісты нацыянальнай зборнай Беларусі выйгралі ў Каўнасе ў каманды Літвы — 2:0.

Матч быў прынцыповы для беларусаў, бо ўжо 3 верасня ім давядзецца правесці ў гасцях з французамі свой першы матч у групе адборачнага турніру да чэмпіянату Еўропы-2012. У гэтым плане піхалагічны настрой будзе іграць не апошнюю ролю. Адзначаў гэта напярэдадні гульні і галоўны трэнер беларускай зборнай Бернд ШТАНГЕ:

— Згодна з рэйтынгам ФІФА, Літва пастаянна ўваходзіць у першую паўсотню. Але мы збіраемся перамагчы літоўцаў. Бо калі мы хочам вярнуцца з Парыжа з ачкамі, то павінны нешта пакаяць ужо ў Каўнасе.

Не сказаў быц, што вельмі парадавала гульня беларусаў, але лік тым не менш для нас прыемны. Два галы Вячаслава Глеба не пакінулі літоўцам аніякіх шанцаў. Хоць відавочна, што матч з французамі будзе, як кажуць, ужо зусім з іншай оперы...

Дарэчы, 11 жніўня правялі кантрольныя гульні і сапернікі зборнай Беларусі па группе — зборныя Францыі, Румыніі, Боснії і Герцагавіны, Албаніі і Люксембурга. Вось іх выніКі: Нарвегія—Францыя — 2:1, Турцыя—Румынія — 2:0, Боснія і Герцагавіна — Катар — 1:1, Уэльс—Люксембург — 5:1, Албанія—Узбекістан — 1:0.

Алесь СІВЫ.

ДЕЛА СЕМЕЙНЫЕ

Сколько стоит отправить ребенка в школу?

Самый скромный набор для школьника можно приравнять к бюджету прожиточного минимума.

Конец августа — традиционное время для начала предшкольной лихорадки. Родители впопыхах собирают своих чад в нелегкий поход за знаниями. Проанализировав цены на товары для школы, можно заключить, что путь этот будет еще и недешевым.

По минимальным подсчетам самый недорогой, но при этом полный набор школьных принадлежностей для первоклассника от белорусских производителей обойдется родителям примерно **в 270 тысяч белорусских рублей**. В него войдет все самое необходимое: не только ранец и все нужные для обучения предметы, но и школьная форма, обувь. Стоимость самого дорогого набора приближается к **880 тысячам рублей**.

Для старшеклассников цены немного выше — от 280 — до 1150 тысяч белорусских рублей.

Стоит заметить, что цена даже самого дешевого школьного набора близка к уровню бюджета прожиточного минимума (БМП). Как известно, с 1 августа в Беларуси БПМ для трудоспособного населения установлен в размере 293 тысяч 880 белорусских рублей, для пенсионеров он составляет 245.10 рублей, для детей и студентов — 294.670 рублей, для детей в возрасте от 3 до 16 лет — 336 тысяч 860 рублей, а для детей в возрасте до 3 лет — 245.860 рублей.

Как отмечают представители Беллегпрома, для того, чтобы удержать цены школьных наборов на низком уровне, им пришлось пойти на определенную хитрость. Самые бюджетные наборы формируются из товаров, которые остались от прошлого сезона. Они на сто процентов качественные, но уже немного устаревшие. Такие наборы ориентированы прежде всего на сельских жителей, которым тяжело позволить себе что-то более дорогое.

Работники магазинов отмечают, что всплеск торговли товарами для детей начинается в двадцатых числах августа. Родители возвращаются из отпусков, а дети — из лагерей и деревень, и все вместе устремляются на поиски всего необходимого к школе. Продавцы советуют родителям не откладывать покупку школьных принадлежностей на последний момент хотя бы из-за того, что уже сейчас магазины могут предложить полный ассортимент товаров. Чем ближе к сентябрю, тем большая вероятность, что все самое интересное достанется чужому ребенку.

Но если даже сейчас вы не смогли найти вещи нужного вам размера, магазины открыли новую услугу. Теперь недостающую часть комплекта можно дозаказать, оставив заявку в магазине. А почти все белорусские предприятия начали шить специальные комплекты одежды для детей с нестандартными фигурами, так что теперь найти брюки с широкой талией для мальчика или просторную блузку для девочки будет не так сложно.

Мария МАЛЕВИЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
13—16 ЖНІЎНЯ 2010 г.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Станіслаў ШУШКЕВІЧ:

«Здзек у выглядзе абразлівай пенсіі адпавядае Канстытуцыі...»

Напрыканцы мая былы старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч праз "Народную Волю" звярнуўся з адкрытым лістом да шэрагу высокапастаўленых чыноўнікаў. Шушкевіч прасіў іх звярнуцца ў Канстытуцыйны суд Беларусі, які б расцлумачыў, чаму ён, былы кіраўнік краіны, атрымлівае ганебную пенсію памерам 3200 рублёў у месяц...

"Вярхоўны Савет РБ 12-га склікання прыняў закон аб маім пажыццёвым пенсіённым забеспячэнні, — напісаў тады Станіслаў Станіслававіч прэм'ер-міністру — **Сяргею Сідорскаму**, старшыні Савета Рэспублікі **Анатолю Рубінаву**, старшыні Палаты прадстаўнікоў **Уладзіміру Андрэйчанку**, кіраўніку Адміністрацыі прэзідэнта **Уладзіміру Макею** і старшыні Вышэйшага Гаспадарчага суда **Васілю Камянкову**. — *Мая пенсія, як пенсія вышэйшай службовай асобы ў Беларусі, не дасягала ўзроўню сённяшніх пенсій шараговых дэпутатаў, але, што ўтойваць, была прымальнай.*

9 верасня 1997 года быў падпісаны дэкрэт №16 аб "упарадкаванні пенсій за асобыя заслугі перад беларускім народам", згодна з якім высокія пенсіі пацвярджаны былым вышэйшым функцыянерам ЦК КПБ Сакалову, Палякову, Дземянцею. Іншым былым старшыням Вярхоўнага Савета (або яго Прэзідыума) і мне былі прызначаны так званыя пенсіі памерам 3200 рублёў у месяц. Праўда, з такой мізэрнай пенсіяй застаўся я адзін — М.Грыб атрымлівае больш высокую — вайсковую, С.Шарэцкі выехаў у замежжа, а Г.Таразевіч памёр без пенсіі.

Менавіта такую пенсію "за асобыя заслугі перад беларускім народам" — тры тысячы дзвесце беларускіх рублёў у месяц — я сёння і атрымліваю.

Відавочна, што дэкрэт, калі ён адпавядае Канстытуцыі, не можа ператвараць пенсію ў насмешку, зрабіць яе меншай за мінімальную сацыяльную пенсію, але, паўтараю, па нашых законах я сам не магу звярнуцца ў Канстытуцыйны суд, каб суд гэта пацвердзіў. Таму ў адпаведнасці з артыкулам 116 Канстытуцыі РБ я прашу Вас звярнуцца ў Канстытуцыйны суд, каб ён высветліў, ці адпавядае Канстытуцыі РБ дэкрэт прэзідэнта №16 ад 9 верасня 1997 года, згодна з якім мая пенсія ператворана ў насмешку і ганьбіць не толькі таго, хто яе прызначыў свайм дэкрэтам, але і ўсе дзяржаўныя інстытуты, якія маюць дачыненне да сацыяльнага забеспячэння".

"Народная Воля" пацікавілася ў Станіслава Шушкевіча, што адказалі яму чыноўнікі.

"Так, адказы прыйшлі, але гэта не адказы, а так — адпіскі, — даволі эмацыйна адказаў Шушкевіч. — Прыйшлі яны ад усіх пяці адрасатаў. У адказах напісана, што мая здзеклівая пенсія ў памеры 3200 рублёў у месяц — цалкам адпавядае Канстытуцыі Беларусі. Праўда, спадар Камянкоў у сваім адказе параіў яшчэ раз звярнуцца ў Савет міністраў. Я, канечне, такі зварот бліжэйшым часам напішу, але ведаю, што адказ будзе такім, як і ўсе папярэднія...

Падобныя адказы сведчаць аб тым, што высокія кіраўнікі розных ведамстваў проста баяцца прызнаць, што ў краіне парушаецца Канстытуцыя... Звярнуцца па гэтым пытанні да Аляксандра Лукашэнкі я не магу — толькі ў ягоную Адміністрацыю, адкуль ужо дачыненне да сацыяльнага забеспячэння".

"Народная Воля" пацікавілася ў Станіслава Шушкевіча, што адказалі яму чыноўнікі.

"Так, адказы прыйшлі, але

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Громкие аресты в столице

В центре криминальной истории оказался еще не построенный жилой комплекс "Лебяжий".

Прокуратура Минска возбудила уголовное дело по ч.2 ст.430 УК РБ ("Получение взятки") в отношении начальника отдела жилищной политики и директора УКС администрации Центрального района.

Первоначально оперативники предполагали, что речь идет о банальном подстрекательстве к даче взятки, которое зачастую оказывается мошенничеством.

В данном случае директор одной из столичных фирм весьма настойчиво на протяжении нескольких недель "уговаривал" индивидуального предпринимателя "дать кому надо", чтобы знакомая последнего смогла заключить договор долевого строительства квартиры в строящемся жилом доме в микрорайоне "Лебяжий".

Этот вопрос, по словам подстрекателя, могли положительно решить за 6 тысяч долларов известные ему должностные лица администрации Центрального района.

Передача денег потенциальной дольщицы директору фирмы состоялась утром 3 августа на улице Максима Танка. И проходила она под присмотром милиционеров. Подстрекатель же оказался самым настоящим посредником. Через несколько часов возле гостиницы "Минск" он передает 4 тысячи долларов начальнику отдела жилищной политики администрации Центрального района, который в свою очередь половину этой суммы вручает директору УКС. Последнего задержали утром 4 августа в момент получения денег в его служебном кабинете.

По сведениям "Белорусских новостей", главные фигуранты этой криминальной истории были арестованы прокуратурой 6 августа. Проводится расследование. Далеко не первое в городских уголовных делах "жилищной политики".

Напомним, в настоящее время под следствием находится теперь уже бывший начальник управления жилищной политики Мингорисполкома Николай Ком. 25 мая Главным следственным управлением предварительного расследования МВД ему было предъявлено обвинение в неоднократном получении взяток и превышении служебных полномочий.

За забойства мужа... усяго палтара гады

Ноччу 1 чэрвеня 2009 года жанчына падчас сваркі з мужам нанесла яму не менш як 10 удараў сякерай у вобласць галавы.

У той жа дзень вечарам жанчына і яе дарослы сын, які жыве асобна, на аўтамабілі вывезлі труп і закапалі ў склепе свайго дачнага дома, а праз тыдзень — забеталі.

Труп быў знойдзены 23 студзеня 2010 года, піша БелаПАН. Судовая псіхолага-псіхіятрычная экспертыза ўстанавіла, што падчас учынення забойства жанчына знаходзілася ў стане афекту.

28 чэрвеня 2010 года суд Ленінскага раёна Брэста прызнаў яе вінаватай ва ўчыненні злачынства і прызначыў пакаранне ў выглядзе аднаго года шасці месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Судовая калегія па крымінальных справах Брэсцкага аблсуда пакінула касацыйную скаргу асуджанай без задавальнення, і прыгавор набыў законную моц.

ПАД ГРАДУСАМ

Беларускі клімат набліжаецца да экстрэмальнага

Анамальна халодныя зімы і надзвычай спякотнае лета — па словах некаторых спецыялістаў, хутка для Беларусі такі кліматычны стан будзе нармальным, і насельніцтву варта прызвычайвацца да экстрэмальнага надвор'я.

Гэтым летам у Беларусі быў пабіты тэмпературны рэкорд. У 1946 годзе максіма ў краіне дасягнула 38°С. Не так даўно навукоўцам прыйшлося мяняць паказчыкі ў энцыкладеіях, бо на тэрыторыі гомельскага аэрапорта паветра прагрэлася да +39,2°С.

Па назіраннях спецыялістаў, тэмпература ў гэтым ліпені ўжо перавысіла норму ў сярэднім на 4,5°С. Нічога надзвычай важнага ў гэтым не было б, калі б гарачыня не трымалася так доўга. Нармальная колькасць гіперспякотных дзён для беларускага лета — не больш за 5. У гэтым годзе гэты паказчык ужо перавышаны ў 4—5 разоў.

Анамальная спякота выклікала пашкоджанне сельскагаспадарчых культур. У Гомельскай вобласці пакутуе ўраджай кукурузы. Раслінам нестае вільгаці, і з-за гэтага катахі вырастаюць маленькімі з дробнымі зярняткамі. Ураджай бульбы таксама стаў ахвярай гарачыні. Зашмат сонца і для капусты.

Назіраецца паніжэнне ўзроўню вады ў рэках і азёрах. Вадаёмы праграюцца настолькі, што ў асобных месцах тэмпература вады дасягае 26°С са знакам плюс.

Новая хваля гарачыні прынесла паветра з Расіі, а разам з ім рэдкія дажджы і навалніцы. Спад цеплыні варта чакаць бліжэй да 19 жніўня. Дзённая тэмпература панізіцца да +18—25°С. Пачнуцца кароткачасовыя дажджы, навалніцы.

Існуе і папярэдні прагноз на верасень. Па словах метэаролагаў, надвор'е ў першы восеньскі месяц стане больш камфортным, пры гэтым цеплыня спадзе, але не сыдзе цалкам. Тэмпература будзе бліжэйшай да кліматычнай нормы, але хутчэй за ўсё перавысіць яе на некалькі градусаў. Калі кліматычная норма для верасня складае +11—13°С, то ў гэтым годзе варта чакаць +16—21°С.

Сіноптыкі сцвярджаюць, што сёлетняе павышэнне тэмпературы пачалося яшчэ трыццаць гадоў таму. На пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя быў зафіксаваны рэзкі ўспліск росту тэмпературы ў свеце. З тых часоў тэмпература ў сярэднім павысілася на 1°С. За такі кароткі тэрмін гэта вельмі вялікі паказчык.

Марыя МАЛЕВІЧ.

БЛІЦ

На пераломных этапах гісторыі важнейшую ролю могуць адыгрываць палітычныя партыі, грамадскія рухі, розныя суполкі. Але пры гэтым, як вядома, яны павінны мець цесныя сувязі з працоўнымі калектывамі.

Зыходзячы з такога пастулата, "Народная Воля" задала шэрагу палітычных і грамадскіх лідэраў адно пытанне:

«Якія сувязі ў Вас з рабочымі заводаў і фабрык?»

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

— А чаму пад працоўнымі калектывамі мы разлядаем толькі рабочых фабрык і заводаў? Для нас рабочы калектыў — гэта і прадпрымальніцкае асяроддзе. Гэта рынкі, людзі, якія працуюць у шпіталях, настаўнікі... Мы — не РСДРП, якая рыхтуе рэвалюцыю праз заводскія прахадныя. Хоць туды мы таксама ідзём. Але асноўная маса нашых партыйцаў — індывідуальныя прадпрымальнікі, работнікі ў шпіталях і настаўнікі. Ёсць і рабочыя буйных прадпрыемстваў. Не скажу, што гэта вялікая колькасць, але такія людзі ёсць. І падчас перадвыбарнай кампаніі будзем задзейнічаць усіх.

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада):

